# Гісторыя

Н. К. ЦЕЦЕРУКОЎ

## ДЗЕЙНАСЦЬ КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ ПА ПАВЫШЭННЮ РОЛІ ЛЕКЦЫЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ Ў ІДЭЙНА-ПАЛІТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ РАБОЧЫХ ПРАМЫСЛОВАСЦІ (1966—1970)

Ідэйна-палітычнае выхаванне ўяўляе сабой састаўную частку працэсу будаўніцтва камунізма. Неабходнасць і важнасць павышэння палітычнай сталасці рабочага класа ўзрастае па меры таго, як расшыраюцца маштабы задач камуністычнага будаўніцтва, якія патрабуюць ад кожнага чалавека свядомага, добрасумленнага і адукаванага дзяржаўнага падыходу да іх вырашэння. Значэнне павышэння ўзроўню і дзейнасці ідэйна-палітычнага выхавання рабочых «...асабліва вялікае цяпер,—падкрэсліў тав. Л. І. Брэжнеў,—калі паміж сацыялізмам і капіталізмам ідзе вострая ідэалагічная барацьба» [1]. У пастанове ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы» (красавік 1979) падкрэсліваецца, што яна «павінна быць узнята на больш высокі якасны ўзровень, які адпавядае патрабаванням развітога сацыялізма, новым задачам камуністычнага будаўніцтва» [2]. Ідэйна-палітычнае выхаванне прамысловых рабочых немагчыма без эфектыўнай лекцыйнай прапаганды. Яе роля і значэнне былі высока ацэнены пастановай ЦК КПСС «Аб стане і мерах паляпшэння лекцыйнай прапаганды» (сакавік 1978). Лекцыйная прапаганда «...трывала ўвайшла ў духоўнае жыццё краіны, ператварылася ў дзейсны фактар фарміравання навуковага светапогляду, актыўнай жыццёвай пазіцыі, высокіх ідэйна-палітычных і маральных якасцей савецкіх людзей, адыгрывае важную ролю ў павышэнні эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы» [3].

Партыя заўсёды разглядала лектараў як свой баявы актыў, які нясе жывое слова ў масы, дапамагае ажыццяўляць ідэалагічныя, сацыяльныя і эканамічныя задачы. У гады восьмай пяцігодкі адбыліся якасныя змены ў лекцыйнай прапагандзе рэспублікі і, ў прыватнасці, на прамысловых прадпрыемствах. Асноўнымі звеннямі, якія ажыццяўлялі лекцыйную прапаганду ў прамысловасці былі групы дакладчыкаў і лектараў партыйных камітэтаў. У 1966 годзе ў партыйных арганізацыях Беларусі налічвалася 8470 дакладчыкаў, 146 штатных і 2778 нештатных лектараў [4]. Але самы шматлікі атрад лектараў мела таварыства «Веды». На прадпрыемствах прамысловасці, транспарту і будоўляў у канцы 1966 года дзейнічала 634 пярвічныя арганізацыі таварыства. Да канца 1970 года іх колькасць павялічылася больш, чым у два разы [5].

Павышаючы якасць і дзейнасць лекцыйнай работы, партыйныя камітэты, пярвічныя партыйныя арганізацыі кіраваліся ўказаннямі У. І. Леніна аб тым, што ідэйна-палітычны напрамак лекцый вызначаецца саставам лектараў. На лекцыйную работу накіроўваліся тэарэтычна і палітычна адукаваныя людзі, здольныя данесці палітыку партыі да шырокіх мас. Так, напрыклад, у 1966 годзе вышэйшую і незакончаную вышэйшую адукацыю мелі 5985 (або 70,6 %) дакладчыкаў і 2832 (або 96,6 %) лектараў партыйных камітэтаў, адпаведна 3529 (або 41,6 %) і 1396 (або 44,9 %) з іх складалі партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія работнікі, а астатнія—гаспадарчыя кіраўнікі, ІТР і спецыялісты народнай гаспадаркі, навуковыя работнікі [6]. У ліку 74 062 членаў таварыства «Веды» было 2195 вучоных, 4479 партыйных, савецкіх, прафсаюзных і кам-

самольскіх работнікаў, 5785 навуковых работнікаў, выкладчыкаў ВНУ і сярэдніх навучальных устаноў, 38933 настаўніка, больш 14 тыс. спецыялістаў народнай гаспадаркі [7]. На прамысловых прадпрыемствах членамі таварыства «Веды» былі кіраўнікі прадпрыемстваў, галоўныя спецыялісты і ІТР. Надаючы важнае значэнне падбору лектараў, партыйныя камітэты павышалі ўзровень іх вучобы. Гэтаму служылі пастаянна дзеючыя семінары і школы лектараў.

У восьмай пяцігодцы значна палепшылася структура і тэматычная накіраванасць лекцый. Пераважаючай у іх з'яўлялася грамадска-палітычная тэматыка. Так, напрыклад, калі ў 1966 годзе на прадпрыемствах прамысловасці, будаўніцтва і транспарту па грамадска-палітычнай тэматыцы было прачытана 85 тыс. лекцый (або 62,4 % агульнай колькасці), то ўжо ў 1969 — 124 тыс. (або 77,5 %) [8]. Гэтыя лекцыі ахоплівалі важнейшыя бакі жыцця і выступалі магутным фактарам фарміравання светапогляду, перакананняў, дзеянняў працоўных.

Пасля адбыўшыхся XXIII з'езда КПСС і XXVI з'езда КПБ партыйныя арганізацыі накіроўвалі ўвагу лектараў на прапаганду іх рашэнняў і матэрыялаў. На працягу 1966 года на прадпрыемствах рэспублікі па матэрыялах з'ездаў партыі было прачытана 20 тыс. лекцый і дакладаў, на якіх прысутнічала больш мільёна чалавек. Лектары імкнуліся улічваць спецыфіку прадпрыемстваў, палітычны ўзровень слухачоў. Лекцыі і даклады цесна ўвязваліся з задачамі, пастаўленымі перад працоўнымі калектывамі партыйнымі з'ездамі [9].

Вялікае ўздзеянне на актывізацыю ўсёй лекцыйнай прапаганды аказала падрыхтоўка да 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Рыхтуючыся да гэтай гістарычнай даты, ЦК КПБ, абкомы, гаркомы і райкомы партыі прааналізавалі стан лекцыйнай прапаганды. Так, у ліпені 1966 года прэзідыум ЦК КПБ разгледзеў пытанне «Аб стане лекцыйнай прапаганды ў Гродненскай вобласці». У пастанове прэзідыум адзначыў дадатныя бакі арганізацыі лекцыйнай прапаганды ў працоўных калектывах і па месцу жыхарства, у той жа час былі ўскрыты і істотныя недахопы. На прадпрыемствах было мала арганізавана цыклаў лекцый, лекторыяў і кіналекторыяў, мелі месца недахопы ў вучобе лектараў [10]. Выконваючы пастанову, партыйныя арганізацыі сталі больш увагі ўдзяляць якасці і дзейнасці лекцыйнай прапаганды, вучобе лектараў, улічвалі запытанні рабочых у расшырэнні іх ведаў. Ужо да 10 лютага 1967 года было створана па юбілейнай тэматыцы 3790 цыклаў лекцый і лекторыяў [11]. За 1967 год на прадпрыемствах прамысловасці, транспарту і будоўляў было прачытана 129.727 лекцый, прычым большасць па юбілейнай тэматыцы [12].

Лекцыйная прапаганда ўзбагачалася новымі формамі работы ў масах. Адной з такіх форм з'явіліся кастрычніцкія чытанні. З лекцыямі і дакладамі на іх выступалі партыйныя, савецкія работнікі, кіраўнікі прадпрыемстваў, вучоныя, ветэраны партыі, удзельнікі рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ветэраны працы. За кароткі час кастрычніцкія чытанні атрымалі шырокае распаўсюджванне. Напрыклад, у Маладзечна такія чытанні праходзілі на 25 прадпрыемствах прамысловасці, у Мінскай вобласці на 1168, у Гродзенскай было арганізавана 425 кастрычніцкіх чытанняў [13].

Вялікая лекцыйная работа была разгорнута партыйнымі камітэтамі пры падрыхтоўцы і святкаванні 50-годдзя БССР і КПБ. На прадпрыемствах арганізоўваліся спецыяльныя цыклы лекцый, кіналекторыі, праводзіліся тэматычныя вечары. Напрыклад, толькі на Мінскім абутковым аб'яднанні «Прамень» было арганізавана 15 цыклаў. Усяго ў Мінску дзейнічала 388 цыклаў, на прадпрыемствах Магілёва і вобласці — 662, Віцебска — 582 [14]. Партыйныя арганізацыі завастралі ўвагу на якасці чытаемых лекцый, іх дзейнасці.

У 1966 — 1970 гады на прадпрыемствах рэспублікі значна павялічылася колькасць лекцый, якія выкрываюць буржуазную і рэвізіяніссцкую ідэалогію. Красавіцкі (1968) Пленум ЦК КПСС падкрэсліў, што «непрымірымая барацьба з варожай ідэалогіяй, рашучае выкрыццё падкопаў імперыялізму, камуністычнае выхаванне членаў КПСС і ўсіх працоўных, узмацненне ўсёй ідэалагічнай дзейнасці партыі набывае асаблівае значэнне» [15]. На гэтых пытаннях завастралася ўвага і пры чытанні лекцый па іншых напрамках, асабліва па міжнароднай тэматыцы, якая заўсёды цікавіла рабочых і займала на прадпрыемствах важнае месца. Так, напрыклад, калі ў 1966 годзе лектарамі таварыства «Веды» на прадпрыемствах

прамысловасці, будоўляў і таварыства «Веды» на прадпрыемствах прамысловасці, будоўляў і транспарту было прачытана па міжнароднаму становішчу 43 973 лекцыі, то ў 1970 годзе — 52 266 [16].

У чэрвені 1968 года пленум ЦК КПБ разгледзеў пытанне «Аб стане і мерах паляпшэння масава-палітычнай работы ў рэспубліцы». У пастанове адзначалася неабходнасць паляпшэння ідэйнага выхавання працоўных, для чаго важна было шырэй выкарыстоўваць лекцыйную прапаганду, рэгулярна праводзіць тэарэтычныя канферэнцыі, ленінскія і кастрычніцкія чытанні і іншыя формы лекцыйнай работы [17]. Выконваючы дадзеную пастанову, партыйныя арганізацыі актывізавалі лекцыйную прапаганду, павысілі яе ролю ў ідэйным выхаванні рабочых.

Асаблівае месца ў лекцыйнай прапагандзе на працягу ўсёй пяцігодкі займала ленінская тэматыка. Пасля апублікавання ў ліпені 1968 года Пастановы ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» ЦК КПБ выпрацаваў мерапрыемствы, якімі вызначыў асноўныя напрамкі дзейнасці партыйных арганізацый у справе выканання данай пастановы. У партыйных арганізацыях рэспублікі былі створаны і зацверджаны спецыяльныя групы лектараў і дакладчыкаў. У іх састаў ўвайшлі 48 тыс. найбольш падрыхтаваных і кваліфікаваных лектараў. Кіруючыся спецыяльнай тэматыкай, распрацаванай аддзелам прапаганды і агітацыі ЦК КПБ, партыйныя арганізацыі сумесна з таварыствам «Веды» арганізавалі чытанне цыклавых лекцый, дакладаў, праводзілі тэматычныя вечары і тэарэтычныя канферэнцыі.

На многіх прадпрыемствах праводзіліся вечары, прысвечаныя саратнікам У. І. Леніна, а таксама было арганізавана чытанне лекцый па працах У. І. Леніна «Што рабіць?», «Дзяржава і рэвалюцыя», «Дзіцячая хвароба «левізны» у камунізме». Шырокае распаўсюджванне атрымалі ленінскія чытанні. У аснову іх арганізацыі быў пакладзен вопыт правядзення кастрычніцкіх чытанняў. У прапагандзе жыцця і дзейнасці У. І. Леніна, яго тэарэтычнай спадчыны партыйныя арганізацыі ўмела выкарыстоўвалі і такія формы лекцыйнай прапаганды, як лeнініяны, тэарэтычныя канферэнцыі, сустрэчы з ветэранамі ленінскай гвардыі, кіналекторыі.

Вялікая лекцыйная работа праводзілася на прадпрыемствах рэспублікі па прапагандзе матэрыялаў Міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый (1969), снежаньскага (1969) Пленума ЦК КПСС, па падрыхтоўцы да XXIV з'езда КПСС і святкавання 25-й гадавіны перамогі над фашысцкай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй.

Такім чынам, Кампартыя Беларусі ў гады восьмай пяцігодкі накапіла пэўны вопыт ідэйна-палітычнага выхавання прамысловых рабочых. За гэты час павысіўся навуковы ўзровень лекцыйнай прапаганды, умацавалася сувязь з жыццём, яна ўзбагацілася новым зместам і новымі формамі, стала палітычна вастрэйшай і больш наступальнай. Узрасла роля лекцыйнай прапаганды ў ідэйным выхаванні рабочых, павышэнні іх свядомасці і камуністычнай перакананасці, што адбівалася на актывізацыі барацьбы за паспяховае выкананне заданняў восьмай пяцігодкі.

[1] Брежнев Л. И. Дело Ленина живет и побеждает.— М., 1970, с. 75.
[2] Гл.: Коммунист, 1979, № 7, с. 10—20.
[3] Гл.: Правда, 1978, 5 марта.
[4] ПА ИИП при ЦК КПБ, ф. 4, воп. 71, спр. 292, арк. 33, 34.
[5] ЦГАОР БССР. ф. 1030, воп. 2, спр. 307, арк. 4, 5.
[6] ПА ИИП при ЦК КПБ, ф. 4, воп. 71, спр. 291, арк. 51; спр. 279, арк. 33, 34.
[7] ЦГАОР БССР, ф. 1030, воп. 2, спр. 307, арк. 5.
[8] Текущий архив Правления общества «Знание» Белорусской ССР: Обзор лекционной деятельности за 1966—1970 гг.— Мінск, 1972, с. 2, 7.
[9] ПА ИИП при ЦК КПБ, ф. 4, воп. 71, спр. 297, арк. 26.
[10] Там жа, арк. 27; воп. 81, спр. 2041, арк. 5—11.
[11] Там жа, воп. 71, спр. 231, арк. 55.
[12] ЦГАОР БССР, ф. 1030, воп. 2, спр. 337, арк. 1.
[13] ПА ИИП при ЦК КПБ, ф. 4, воп. 71, спр. 229, арк. 14, 89. 90.
[14] Там жа, ф. 4, воп. 71, спр. 302, арк. 206; спр. 321, арк. 25; спр. 302, арк. 206.
[15] Гл.: Вопросы идеологической работы КПСС: Сборник важнейших решений КПСС (1965—1972 гг.).— М., 1972, с. 86.
[16] ЦГАОР БССР, ф. 1030, воп. 2, спр. 307, арк. 11.
[17] ПА ИИП при ЦК КПБ, ф. 4, воп. 20, спр. 461, арк. 12—14.
[18] Там жа, воп. 81, спр. 2165, арк. 13, 55—61; воп. 71, спр. 321, арк. 34.